**Зьміцер Саўка**

# Аповед пра Іона Аксэльрода

## Аповед пра Іона Аксэльрода

Іон Аксэльрод
    ішоў дадому
І раптам спаткаў
    ката.
Іон Аксэльрод
    прыйшоў дадому,
Знайшоў здаравенна мяха.

Іон Аксэльрод
    стараўся бяз шуму
Пракрасьціcь паўз жоўты плот.
Але ён меў рудую бэрэтку —
Яго заўважыў
    кот.

Аднак Іон
Не
разгубіўся
І кінуў бэрэтку ў сьнег.
Кот, працяты вялікаю крыўдай,
Зваліўся ў падстаўлены мех.

Іон закрычаў:
«А дзе ж ваш гонар?!
Так лёгка патрапіць у мех!»
А кот
    зірнуў Іону ў вочы —
У вачох
    застыг
    сьмех.

*зіма-вясна 1993*